

*А. С.* ***Аксамітаў***.

*Літ.*: Беларускія народныя прыкметы і павер'і. Кн. 3. Зямная дарога ў вырай. Мн., 1999. С. 457.

*У. А. Васілевіч.*

**АЙСНЕР** (Eisner) Пауль (1880—1948), чэшскі славіст, перакладчык, журналіст, паэт. Доктар філалогіі (1918). Скончыў нямецкі універсітэт у Празе (1918). Вывучаў германістыку, раманістыку, славістыку, аддаваў перавагу славянскаму фальклору. Галоўны кірунак дзейнасці А. — пераклад і пасрэдніцтва ў азнаямленні з культурамі розных народаў. У 1926 Інстытут бібліяграфіі ў Лейпцыгу выдаў на нямецкай мове яго зборнік «Народныя песні славян», каб пазнаёміць нямецкага, а праз пасрэдніцтва нямецкай мовы — еўрапейскага чытача са славянскімі нар. песнямі. У ім прадстаўлена 42 бел. нар. песні: «Купала на Ивана», «Ой ты, хмель», «Ой, палын, мой палыночак», «Замуж пайсці — трэба знаць», «Ой, зелена, зелена», «Вясна красна, што ты нам прынясла» і інш. Аўтар імкнуўся захаваць асаблівасці бел. нар. песні, яе меладычнасць і напеўнасць, прастату і задушэўнасць, лірызм. Падбор песень усебакова характарызуе жыццё бел. народа, яго характар і душу. Бедна пададзены калядныя і сямейна-бытавыя песні, з гістарычных — толькі адна. Значную каштоўнасць надаюць выданню дакладныя і падрабязныя каментарыі, якія раскрываюць паходжанне і гісторыю развіцця бел. нар. песні, тлумачаць незразумелыя замежнаму чытачу выразы, звязаныя з абрадамі ці звычаямі. З прадмовы відаць, што А. не змог поўнасцю акрэсліць і ацаніць бел. нар. песню, каб бачыць у ёй толькі спалучэнне рыс рускай і ўкраінскай песні. Пэўны недахоп выдання — адсутнасць крыніц, не падаюцца назвы песень у арыгінале. Кніга атрымала станоўчыя водгукі. Яе высока ацаніў А.Брукнер у часопісе «Архіў славянскай філалогіі» (1929, № 42).

*Літ.*: Сакалоўскі У. Пара станаўлення: Вопыт параўнальнага вывучэння бел. і некаторых класіч. зарубеж. літаратур. Мн., 1986. С. 54—56.

*У. Л. Сакалоўскі.*

**АКАЗІЯНАЛЬНЫЯ АБРАДЫ** (ад старалац. occasionalis выпадковы), абрады, якія ўзнаўляюцца ў побыце час ад часу, па меры неабходнасці або ўзнікнення асобных, часцей крытычных, крызісных абставін. Характарызуюцца рухомасцю, своеасаблівым характарам працякання абрадавага часу, залежным ад жыццёвых абставін, якія выклікалі правядзенне гэтых абрадаў. Абрадавым дзеянням і вербальным тэкстам аказіянальнай абраднасці ўласцівы трываласць і ўстойлівасць (кансерватызм і архаічнасць), звязаныя з тым, што А.а. праводзяцца з нагоды сітуацый, выкліканых парушэннем звыклага жыцця чалавека і ўзнікнення вострай неабходнасці іх змянення. Магічны характар аказіянальнага абрадавага дзеяння падкрэсліваўся паўторамі тэкстаў і дзеянняў, абмежаваннем полу і ўзросту выканаўцаў, рухам па коле, крыжамі і інш. Абрадавымі сродкамі выступалі розныя матэрыяльныя рэчы, абрадавая ежа, вада, нават жывёлы і птушкі, якія выконвалі ў абрадзе сімвалічную аберагальную і ачышчальную ролю. Да А.а. адносяцца абрады і звычаі выклікання дажджу ў час засухі: сімвалічнае аранне або баранаванне высахлага вадаёма, дарогі, забіванне жабы, вужа, рака, разбурэнне мурашніка і інш. Існуе таксама нямала відаў аказіянальных звычаяў і галашэнняў. У.Сысоў вылучае галашэнні пры пажары, паводцы, голадзе, хваробах, крыўдзе, нядолі і інш. Некаторыя з А.а. і паэтычных твораў з часам трансфармаваліся ў замовы, дзіцячыя песні, гульні і інш. жанры. У дзіцячых заклічках і прыгаворах ёсць нямала падобных твораў з архаічнымі зачынамі: «Дожджык, дожджык, секані (сыпані, прыпусці, перастань)...», «Сонца, сонца, выблісні ў аконца!», «Соўнушка-ядрушка, выблісні, выглянi!». А.а. і звычаі ўзнаўляюцца пры капанні калодзежа, будаўніцтве хаты, выкананні розных талок. А.а. вучоныя пачалі вывучаць у 1980-я г.

*Літ.*: Чистов К.В. К классификации обрядов жизненного цикла // Язычество восточных славян. Л., 1990; Сысоў У.М. Беларуская пахавальная абраднасць. Мн., 1995.

*М. А. Бабчонак, А. Ю. Лозка.*

**АКСАМІТАЎ** Анатоль Сцяпанавіч (17.7.1926, г. Гомель — 5.2.2003), мовазнавец. Доктар філалагічных навук (1984). Скончыў БДУ (1951). Даследаваў бел. фразеалогію, фразеаграфію, мову бел. фальклору («Лексіка беларускіх прыказак XIX стагоддзя ў сувязі з агульнай праблемай фразеалогіі», 1958; «Беларуская фразеалогія», 1978). Яго комплексная методыка збору і аналізу моўнага матэрыялу спалучала фразеалогію